

АРТУР ПРУПАС

# Фаліянты, бестсэлеры… і іншыя тамы

## Кнігавыдаўцы з 25 краін прынялі ўдзел у XX Мінскай міжнароднай кніжнай выставе

Паліцы старажытнай бібліятэкі, устаўленыя фаліянтамі… Прыстаўленая да іх лесвіца… Што можа лепш сімвалізаваць шлях чалавецтва да ведаў? Менавіта гэтыя сімвалы былі выкарыстаныя ў афармленні нацыянальнага стэнда Беларусі на XX Мінскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы, якая прайшла ў выставачным цэнтры "БелЭкспа".

Сугучны сімвалам і дэвіз выставы — "Чытаючы кнігу, знаходзіш сябе!" Прэзідэнт Беларусі павіншаваў удзельнікаў XX Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што за мінулыя 20 гадоў гэты форум стаў не толькі адной з яркіх падзей у культурным і духоўным жыцці краіны, але і набыў шырокую вядомасць у сусветным кніжным згуртаванні. "Цяперашняя юбілейная выстава-кірмаш падводзіць своеасаблівы вынік Года кнігі, вялікай і карпатлівай работы па папулярызацыі чытання, літаратуры, мастацкага слова", — гаварылася ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў арганізатарам і ўдзельнікам выставы плённай працы і поспехаў, а яе гасцям — цікавых і запамінальных зносінаў з выдатным светам кнігі.

Так, мінулы год у Беларусі прайшоў пад знакам кнігі. І гэтая выстава-кірмаш — лепшы спосаб падвядзення яго вынікаў і адначасова пацвярджэнне, што ў бібліятэках не стане бязлюдна. Няхай і з'яўляюцца новыя носьбіты інфармацыі і б'юць трывогу ва ўсім свеце аб падзенні цікавасці да чытання. Шмат наведвальнікаў — сведчанне, што тая цікавасць у беларусаў не знікла.

Кожны дзень работы выставы — гэта маса мерапрыемстваў на любы густ. У дзень адкрыцця — прэзентацыя "Першакніга беларускага народа". Факсімільнае выданне Полацкага Евангелля, унікальнага рукапісу XII стагоддзя, — гэта, безумоўна, падзея. Гэтак жа, як цудоўны том "Полацк. 1150", падрыхтаваны выдавецтвам "Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі" да юбілею старажытнага горада. Тое ж выдавецтва прапануўвае азнаёміцца і з вынікам расійска-беларускага праекта — фаліянтам "Беларусы Масквы.

XVII стагоддзе". Знакавай можна назваць прэзентацыю яшчэ адной сумеснай работы — першай ластаўкі серыі "Сугучча сэрцаў" зборніка "З думай аб Радзіме", які выйшаў у выдавецкім доме "Звязда".

Немагчыма было абысці ўвагай экспазіцыю ганаровага госця — Расіі. Сваю прадукцыю паказвалі каля 200 арганізацый плюс восем тэматычных экспазіцый — "Свет славянскай культуры", "Гісторыя. Культура. Навука. Адукацыя" і іншыя. А вось фотаздымкі, зробленыя легендай савецкай і расійскай журналістыкі Юрыем Абрамачкіным, які ўваходзіў у пул "крамлёўскіх" фатографаў, што стваралі летапіс эпохі. Аб тым, як будзе выглядаць расійская кніга, можна меркаваць па малюнках студэнтаў факультэта графічных мастацтваў Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта друку імя Івана Фёдарава. Дарэчы, аналагічная выстава студэнтаў Беларускай акадэміі мастацтваў размясцілася на арт-паверсе кірмашу. Не маглі не выклікаць цікавасці дыскусія "Погляд кнігагандляра на праблему чытання" і "круглы стол", прысвечаны 70-годдзю Сталінградскай бітвы.

Традыцыйна сюды прыходзяць сем'ямі, настаўнікі прыводзяць школьнікаў. Бо выхоўваць чытача трэба з самага ранняга дзяцінства, паняцці "сям'я" і "кніга" павінны стаць непадзельнымі. Гэта адзін з клопатаў духоўна-асветніцкай праграмы "Сям'я — Яднанне — Айчына". Яна прэзентавала праект міжнароднага кластара "Цэнтр сям'і". На арт-паверсе можна было ўбачыць макет планаемага цэнтра, а менавіта "Сёмкаўскага Версаля" — унікальнага сядзібна-паркавага комплексу XVIII стагоддзя ў вёсцы Сёмкава пад Мінскам. Некалі гэта была рэзідэнцыя апошняга мінскага ваяводы Хмары, сёння ад сядзібы засталіся адны руіны. Але калі праект будзе рэалізаваны, адродзіцца яшчэ адзін унікальны помнік нашай гісторыі.

Стэнд Францыі, якая ў свой час таксама была ганаровым госцем мінскай выставы, быў афармлены ў выглядзе парыжскага кафэ. Тут можна было далучыцца да абмеркавання тэндэнцый у літаратуры Францыі, а таксама да дыскусіі, што такое кніжны кірмаш — вітрына краіны, адбітак грамадства, кніжны рынак або нешта іншае.

Тое, што можна набыць навінкі, безумоўна, прыцягвае наведвальнікаў. Беларусам ёсць чым ганарыцца: карычневыя з золатам тамы дваццацітомнага збору твораў Якуба Коласа, вось зялёныя са срэбрам — Максіма Танка... У абодвух класікаў у Год кнігі прайшоў юбілей. На арт-паверсе экспазіцыя лаўрэатаў нацыянальнага конкурсу "Мастацтва кнігі" мінулых гадоў. А хто перамог у цяперашнім, ужо 52-м, конкурсе, урачыста абвясцілі ў першы дзень работы выставы ў Нацыянальнай бібліятэцы. На конкурс было пададзена 175 работ, з іх у лонг-ліст журы выбрала самыя лепшыя. Усяго журы вылучыла пераможцаў у 14 намінацыях. Уладальнікам Гран-пры ў намінацыі "Трыумф" стаў фотаальбом "Полацк. 1150". Ганаровы знак-сімвал "Залаты фаліянт" і ганаровы дыплом імя Францыска Скарыны ўручаныя выдавецтву "Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі", дызайнеру Усеваладу Свентахоўскаму і паліграфічнаму прадпрыемству — выдавецтву "Беларускі Дом друку". Перамогу ў намінацыі "Духоўнасць" атрымала факсімільнае духоўна-асветнае выданне "Жыціе блажэннай Еўфрасінні, ігуменні манастыра Уседзяржыцеля Святога Спаса ў горадзе Полацку"

Аднак у кнігі ёсць не толькі аўтар, афарміцель, выдавец, але і распаўсюджвальнік, той, хто дапаможа ёй дайсці да чытача. Тут свае майстры, ім і прызначаныя дыпломы Міністэрства інфармацыі "Лепшая кнігарня ў Год кнігі".

Прайшоў на выставе і дзень украінскай кнігі, аўтограф-сесія алімпійскіх чэмпіёнаў Аляксандра Мядзведзя і Алены Бяловай — герояў серыі "Жыццё выдатных людзей Беларусі" "Мастацкай літаратуры", адкрыты мікрафон "Сучасны погляд на выхаванне школьнікаў" — ды ўсяго не пералічыш.

З плаката на пярэстую кірмашовую мітусню глядзеў наш першадрукар Францыск Скарына. У 2017 годзе споўніцца 500 гадоў з дня выдання ім першай кнігі на беларускай мове. Чаго дасягнулі за мінулыя стагоддзі яго пераемнікі — можна было ўбачыць на цяперашнім форуме, у якім прымалі ўдзел прадстаўнікі 25 краін.

Веніямін **Хмарын**